мы позволит усовершенствовать и сделать более эффективной систему подготовки будущего учителя к формированию функциональной грамотности школьников.

**Список использованных источников:**

1. Жук, О. Л. Направления и механизмы подготовки будущих педагогов к формированию у школьников функциональной грамотности / О. Л. Жук // Весці БДПУ – Серия 1. – 2021. – № 3. – С. 6–12.
2. Образовательная система «Школа 2100». Педагогика здравого смысла : сб. материалов / под науч. ред. А. А. Леонтьева. – М. : Баласс, Издательский дом РАО, 2003. – 368 с.
3. Формирование и оценка функциональной грамотности учащихся: Учебно-методическое пособие / И. Ю. Алексашина, О. А. Абдулаева, Ю. П. Киселев; науч. ред. И. Ю. Алексашина. – СПб. : КАРО, 2019. – 160 с.
4. Холодная, М. А. Приоритеты современного школьного образования: способность адаптироваться к социуму или интеллектуальное развитие и воспитание? / М. А. Холодная // Психология и современное российское образование : материалы IV Всероссийского съезда психологов образования России; 8-12 декабря 2008 г., Москва. – М., 2008. – С. 381–383.

УДК 364-27:338.46:311.4

# ФІНАНСАВА-СТАТЫСТЫЧНЫ АНАЛІЗ АКАЗАННЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ АДРАСНАЙ САЦЫЯЛЬНАЙ ДАПАМОГІ

**С. І. Міхайлаў**

*Віцебск, ВДУ імя П. М. Машэрава*

(e-mail: mikhaylovsi@mail.ru)

**Анатацыя.** На падставе вывучэння фінансавых і статыстычных дакументаў ДУ «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна г. Віцебска» ў артыкуле аналізуюцца дынаміка і аб’ёмы аказання дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі за апошнія тры гады (2019–2021), выяўляюцца асноўныя катэгорыі атрымальнікаў названай сацыяльнай дапамогі, а таксама прапануюцца шляхі ўдасканалення яе аказання.

**Ключавыя словы:** сацыяльна неабароненыя пласты насельніцтва, дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога, дынаміка змянення,тэмп росту, эфектыўнасць прадастаўлення.

# FINANCIAL AND STATISTICAL ANALYSIS OF THE PROVISION OF STATE TARGETED SOCIAL ASSISTANCE

**S. I. Mikhailau**

*Vitebsk, VSU named after P. M. Masherov*

**Abstract.** Based on the study of financial and statistical documents of the State Institution “Territorial Social Service Center of Pervomaisky district of Vitebsk”, the article analyzes the dynamics and volumes of state targeted social assistance over the past three years

(2019-2022), identifies the main categories of recipients of such social assistance, and suggests ways to improve its provision.
**Key words:** socially vulnerable segments of the population, state targeted social assistance, dynamics of change, growth rate, effectiveness of provision.

У кожнай краіне незалежна ад узроўню яе эканамічнага развіцця ёсць сацыяльна неабароненыя пласты насельніцтва, якія маюць абмежаваныя матэрыяльныя рэсурсы і ў сувязі з гэтым адчуваюць патрэбу ў сацыяльнай падтрымцы. Гэта, як правіла, малазабяспечаныя грамадзяне і сем'і, адзінокія інваліды, пенсіянеры, шматдзетныя і няпоўныя сем'і, беспрацоўныя грамадзяне. У сучасных сацыяльна-эканамічных варунках дзейны ў Рэспубліцы Беларусь механізм аказання адраснай сацыяльнай дапамогі з'яўляецца адным з найбольш істотных элементаў дзяржаўнай падтрымкі сацыяльна неабароненых пластоў насельніцтва. У адпаведнасці з прэзідэнцкім Указам № 41 ад 19 студзеня 2012 года «Аб дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамозе (са змяненнямі і дапаўненнямі)», а таксама Указам № 211 ад 15 чэрвеня 2017 года «Аб удасканаленні парадку прадастаўлення дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі» на сённяшні дзень вылучаюцца наступныя яе віды: штомесячная сацыяльная дапамога, аднаразовая сацыяльная дапамога, забеспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця, сацыяльная дапамога для кампенсацыі затрат на набыццё сродкаў гігіены (падгузнікаў, уралагічных пракладак, укладышаў, убіраючых прасцін, пялёнак). У якасці крытэрыяў прадастаўлення таго або іншага віда дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі выступаюць наяўнасць цяжкай жыццёвай сітуацыі (напрыклад, поўная непрацаздольнасць з прычыны інваліднасці ці дасягнення 80-гадовага ўзросту, няздольнасць да самаабслугоўвання ў сувязі з працяглым захворваннем, прычыненне шкоды здароўю, маёмасці ў выніку стыхійных бедстваў і інш.), прыналежнасць да пэўнай сацыяльна-дэмаграфічнай групы, наяўнасць асобных медыцынскіх ці ўзроставых абмежаванняў, асаблівасці сямейнага становішча патэнцыйнага атрымальніка адраснай дапамогі (напрыклад, адзінокі інвалід I і II групы, адзінокі грамадзянін, які дасягнуў узросту 70 гадоў, няпоўная сям'я, у якой адзін з бацькоў ажыццяўляе догляд за дзіцём-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў і інш.). Пры гэтым, у большасці выпадкаў важнай умовай прадастаўлення таго або іншага віда дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі выступае велічыня сярэднедушавога даходу патэнцыйнага прэтэндэнта на яе атрымання (напрыклад, для штомесячнай сацыяльнай дапамогі сярэднедушавы даход павінен быць ніжэй за 100% бюджэту пражытковага мінімуму, для аднаразовай сацыяльнай дапамогі – ніжэй за 150% аналагічнага крытэрыю).

Згодна з дадзенымі Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь, штогод каля 300 тысяч чалавек з'яўляюцца атрымальнікамі

дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі. На нізавым узроўні функцыі па арганізацыі працэсу прадастаўлення такой дапамогі ўскладзены на тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, у прыватнасці – аддзяленне першаснага прыёму, інфармацыі і прагназавання. На сённяшні дзень у рэспубліцы функцыянуе 146 такіх тэрытарыяльных цэнтраў, па адным – у кожным раёне краіны.

Мэтай нашага даследавання з'яўлялася неабходнасць прасачыць асноўныя фінансавыя, сацыяльна-дэмаграфічныя тэндэнцыі ў аказанні дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі за апошнія гады на прыкладзе канкрэтнага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва для наступнага ўнясення прапаноў па аптымізацыі працэсу аказання такой дзяржаўнай дапамогі.

**Матэрыял і метады.** Намі былі прааналізаваны фінансавыя і статыстычныя дакументы аддзялення першаснага прыёму, інфармацыі і прагназавання ДУ «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна г. Віцебска», што ўтрымліваюць звесткі аб прадастаўленні дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі за 2019, 2020 і 2021 гады (колькасць атрымальнікаў, сума прадастаўленай сацыяльнай дапамогі, звесткі аб адмовах у прадастаўленні дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі і інш). Асаблівы акцэнт быў зроблены на фінансава-статыстычны аналіз аб'ёму, структуры, удзельнай вагі асобных відаў дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі, дынаміку яе аказання розным катэгорыям атрымальнікаў за апошнія гады. Акрамя таго, выкарыстоўваліся метады параўнання, супастаўлення, колькаснага аналізу дадзеных.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Згодна са справаздачнымі дакументамі, за 2021 год у ДУ «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна г. Віцебска» па дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу звярнулася 3667 асоб, з якіх 3554 асобам, што складае 96,9% ад ліку заяўнікаў, такая сацыяльная дапамога была прадастаўлена. Колькасць грамадзян, якім была прадастаўлена дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога ў Цэнтры ў 2021 годзе нязначна (на 2,98%) паменшылася ў параўнанні з папярэднім 2020 годам (3554 і 3663 асобы адпаведна). Разам з тым, варта зазначыць, што колькасць атрымальнікаў такой сацыяльнай дапамогі ў Цэнтры ў апошнія гады знаходзіцца на прыкладна аднолькавым узроўні, характарызуючыся нязначнымі ваганнямі. Гэта пацвярджаецца дадзенымі за 2019 год, у якім колькасць атрымальнікаў дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі склала 3558 чалавек і амаль цалкам супала з 2021 годам.

Штогод у Цэнтры назіраецца паслядоўнае павелічэнне агульнай сумы прадастаўленай дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі ў намінальным выражэнні: 1278411 рублёў у 2019 годзе, 1359277 рублёў у 2020 годзе і 1731713 рублёў у 2021 годзе. Тэмп росту 2021 года ў адносінах да 2020 года склаў 127,4%. Нават з улікам афіцыйнага ўзроўню інфляцыі ў Рэспубліцы

Беларусь у 9,97% за 2021 год ёсць падставы гаварыць пра даволі істотны рост сумы аказанай дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі па выніках года ў рэальным выражэнні, г.зн. з улікам пакупніцкай здольнасці.

Удзельная вага розных відаў дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі, аказанай Цэнтрам у 2021 годзе, зыходзячы з сум такой дапамогі, структурна выглядае наступным чынам: найбольш фінансаваёмістым відам па выніках года была сацыяльная дапамога для кампенсацыі затрат на набыццё сродкаў гігіены (падгузнікаў, уралагічных пракладак, укладышаў, убіраючых прасцін, пялёнак) – 941344 рублі (54,36%), штомесячная сацыяльная дапамога за год склала 489565 рублёў (28,27%), на забяспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця было выдаткавана 299503 рублі (17,29%), зусім нязначная сума прыпадае на аднаразовую сацыяльную дапамогу – 1300 рублёў (0,08%).

Сярод атрымальнікаў штомесячнай сацыяльнай дапамогі ў ДУ «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна г. Віцебска» апошнія гады з вялікім адрывам ад астатніх катэгорый грамадзян пераважаюць сем'і, што выхоўваюць дзяцей, у прыватнасці – шматдзетныя і няпоўныя сем'і. Але гэта сітуацыя не з'яўляецца ўнікальнай. Гэта агульнарэспубліканская тэндэнцыя [1]. Пры гэтым, колькасць шматдзетных сем'яў, што атрымліваюць штомесячную сацыяльную дапамогу з кожным годам павялічваецца. Так, за апошнія тры гады колькасць такіх сем'яў узрасла з 59 у 2019 годзе да 88 у 2021 годзе (на 49%). Разам з тым, колькасць няпоўных сем'яў у якасці атрымальнікаў штомесячнай сацыяльнай дапамогі ў Цэнтры няўхільна памяншаецца. За апошнія тры гады іх колькасць зменшылася з 135 у 2019 годзе да 92 у 2021 (амаль на 32%). Па сутнасці, мы назіраем два супрацьлеглыя трэнды, якія прывялі на сённяшні дзень да амаль колькаснай раўнавагі шматдзетных і няпоўных сем'яў сярод атрымальнікаў штомесячнай сацыяльнай дапамогі. Але што датычыцца сум аказанай штомесячнай сацыяльнай дапамогі названым катэгорыям сем'яў, то тут назіраецца істотная аб'ектыўная перавага на карысць шматдзетных сем'яў. У 2021 годзе сума аказанай штомесячнай сацыяльнай дапамогі шматдзетным сем'ям склала 389809 рублёў, што амаль у 6 разоў пераўзыходзіць суму фінансавых сродкаў, выдаткаваных на выплату штомесячнай сацыяльнай дапамогі няпоўным сем'ям – 65997 рублёў. Пры гэтым, сума сродкаў накіраваная на выплату штомесячнай сацыяльнай дапамогі гэтым дзвюм катэгорыям сем'яў у мінулым годзе склала 93,1% ад агульнай сумы выдаткаў на дадзены від дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі (79,6% – шматдзетным сем'ям, 13,5% – няпоўным). Зазначым, што агульная колькасць атрымальнікаў штомесячнай сацыяльнай дапамогі ў Цэнтры ў 2021 годзе склала 796 чалавек. З іх 724 чалавекі (91%) гэта менавіта члены сем'яў, што выхоўваюць непаўнагадовых дзяцей (464 – шматдзетныя сем'і, 234 – няпоўныя, 26 – іншыя тыпы сем'яў). З астатніх 72 атрымальнікаў

штомесячнай сацыяльнай дапамогі найбольш вялікую ў колькасным плане групу (27 чалавек) складаюць адзінокія непрацаздольныя грамадзяне, якія ў нашым выпадку абсалютна ўсе з'яўляюцца інвалідамі II групы.

За мінулы 2021 год у ДУ «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна г. Віцебска» ўсяго толькі 23 чалавекі атрымалі аднаразовую сацыяльную дапамогу на агульную суму 1300 рублёў. Больш за палову з гэтых грамадзян (13 чалавек) – беспрацоўныя асобы, што вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі. У параўнанні з папярэднімі гадамі паслядоўна прасочваецца тэндэнцыя на змяншэнне ў Цэнтры колькасці атрымальнікаў дадзенага віда дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі, а таксама агульнай сумы такіх выплат. У прыватнасці, у 2019 годзе дадзены від адраснай сацыяльнай дапамогі быў аказаны 42 грамадзянам на агульную суму 1967 рублёў, у 2020 – 32 грамадзянам на агульную суму 1624 рублі. Акрамя таго, з улікам пагаршэння сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы ў 2022 годзе (падзенне ВУП, рост беспрацоўя, скарачэнне даходу хатніх гаспадарак і інш), а таксама ўлічваючы той факт, што дадзены від дзяржаўнай дапамогі, у першую чаргу, разлічаны на пераадоленне наступствай цяжкай жыццёвай сітуацыі (напрыклад, пажару), падаецца неабгрунтаваным дастаткова нізкі сярэдні ўзровень дадзенага віда дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі (напрыклад, 56 рублёў у сярэднім за 2021 год па згаданым Цэнтры).

У 2021 годзе ў Цэнтры 824 чалавекі атрымалі сацыяльную дапамогу для кампенсацыі затрат на набыццё прадметаў гігіены (падгузнікаў, уралагічных пракладак, пялёнак і інш.) на агульную суму 941344 рублі. З іх 746 чалавек (90,5%) гэта інваліды I групы, на долю якіх прыходзілася 80,5% ад агульнай сумы выплат па дадзеным відзе дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі. Астатнія 78 чалавек-атрымальнікаў дадзенага віда дапамогі (9,5%) належаць да катэгорыі дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў з IV ступенню страты здароўя. Таксама ў мінулым годзе ў Цэнтры 170 сем'яў (215 дзяцей да двух гадоў жыцця) былі забяспечаны прадуктамі харчавання ў межах адпаведнага віда дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі. Дзеці з шматдзетных сем'яў склалі 54% ад агульнай колькасці атрымальнікаў гэтага віда дапамогі.

**Заключэнне.** Фінансава-статыстычны аналіз структуры, дынамікі і аб'ёму дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі ў канкрэтным тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва дазваляе сцвярджаць, што аб'ём выплат у выглядзе аднаразовых сацыяльных дапамог сёння вельмі недастатковы. Сумы ў памеры 30-50 рублёў, у рэдкіх выпадках 100 рублёў, не вырашаюць праблем кліентаў, што аказаліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, а ў значнай ступені носяць сімвалічны характар. Неабходным, лічу, істотнае ўзняцце сумы выплат па гэтаму віду дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі.

Таксама мэтазгодна ў якасці адной з мер павелічэння памераў выплат па штомесячных і аднаразовых сацыяльных дапамогах адмовіцца ад прывязкі крытэрыяў патрэбнасці да бюджэту пражытковага мінімуму або павялічыць працэнтныя межы такога сацыяльна-эканамічнага параметра (напрыклад, да 150-200% БПМ).

У арганізацыйным плане варта задумацца над перадачай функцый аказання дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі асобнаму структурнаму падраздзяленню (аддзяленню) Цэнтра. Дарэчы, такая арганізацыйна-структурная практыка мела месца ў тэрытарыяльных цэнтрах рэспублікі яшчэ пяць год таму, і была б эфектыйнай на сучасным этапе па прычыне прагназаванага павелічэння колькасці сацыяльна неабароненых пластоў насельніцтва ў бліжэйшыя гады.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Михайлова, Е. Л. Опыт и перспективы социальной работы с семьей / Е. Н. Кукса, И. А. Баранова, Е. Л. Михайлова // Повышение качества профессиональной подготовки специалистов социальной и образовательной сфер: сборник научных статей. – Витебск: ВГУ имени П. М. Машерова, 2022. – С. 175–178. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/33059 (дата обращения: 02.09.2022 г.).

**УДК 37.013.2**

## ОБЕСПЕЧЕНИЕ АКТУАЛЬНОГО ВОСПИТАТЕЛЬНОГО ЕДИНСТВА ИНДИВИДУАЛЬНОГО И КОЛЛЕКТИВНОГО ОПЫТА В СОВРЕМЕННЫХ УСЛОВИЯХ

**Т. Б. Оганян**
*Ростов-на-Дону, РГЭУ (РИНХ)*
(e-mail: zaxarash@yandex.ru)

**Аннотация.** В статье обосновывается необходимость и констатируется отсутствие воспитательного единства индивидуального и коллективного опыта в педагогическом процессе, устанавливаются объективные причины этого, подводится теоретическая база его обеспечения в практической деятельности на основе интеграции педагогических находок исследователей и практиков в современных условиях. Раскрывается сущность принципа единства индивидуального и коллективного опыта в развитии личности как актуального для современной воспитательной практики.

**Ключевые слова:** индивидуальность, коллектив, воспитание, принцип, индивидуальный опыт, коллективный опыт.

## ENSURING THE ACTUAL EDUCATIONAL UNITY OF INDIVIDUAL AND COLLECTIVE EXPERIENCE IN MODERN CONDITIONS

**T. B. Ohanyan**
*Rostov-on-Don, RSEU (RINH)*

**Abstract.** The article substantiates the necessity and states the lack of educational unity of individual and collective experience in the pedagogical process, establishes objective rea-